Источник: "Наша слова" - 2020-03-18

# XII НЯФЁДАЎСКІЯ ЧЫТАННІ



28 лютага 2020 года ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў адбыліся XII Няфёдаўскія чытанні "Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць". З уступным словам выступала першы прарэктар навучальнай установы, доктар філасофскіх навук, прафесар Вінакурава Святлана Пятроўна. Далей з цікавым дакладам "Уладзімір Няфёд і ранняя творчасць Андрэя Макаёнка" выступіў член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Сцяпан Сцяпанавіч Лашук.

У канферэнцыі прынялі ўдзел: Рычард Смольскі, Якаў Ленсу, Валеры Жук, Вадзім Салееў, Яўген Шунейка, Рыгор Баравік і іншыя навукоўцы. У канферэнцыі ўдзельнічалі 86 чалавек (у тым ліку і навукоўцы з Кітайскай Народнай Рэспублікі).

Асабіста мне вельмі спадабаўся даклад Элы Клакоўскай "Сібірскі перыяд творчасці Яна Дамеля". Было цікава. Матэрыялы чытання будуць выдадзены асобным зборнікам.

***Аляксей Шалахоўскі,***
*гісторык культуры.*

Аляксей Шалахоўскі. XII Няфёдаўскія чытанні